суткі, чаму трэба берагчы ад забруджвання пітную ваду, асабліва з адкрытых вадаёмаў і падземных крыніц.

Атрыманыя веды будуць спрыяць пашырэнню кругагляду, павышэнню прафесійнага ўзроўню будучых спецыялістаў культуры і мастацтва.

**Р.С.Матульскі,** *дацэнт*

## НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВАЯ БАЗА СТАНДАРТЫЗАЦЫІ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

У наш час без стандартызацыі, г.зн. дзейнасці, накіраванай на дасягненне аптымальнай ступені ўпарадкавання ў пэўнай галіне шляхам устанаўлення палажэнняў для ўсеагульнага і шматразовага прымянення ў адносінах рэальных або патэнцыяльных задач, немагчымыя ні інтэграцыя з сумежнымі галінамі вытворчасці ці навукі, ні плённае супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, забеспячэнне канкурэнтаздольнасці тавараў і паслуг.

Таму зусім не дзіўна, што цяпер на першы план выходзіць праблема праектавання адукацыйных сістэм у кантэксце вызначэння нормы "ідэальнага тыпу", таго, што называюць "адукацыйным стандартам".

Спецыялістамі адукацыйны стандарт вызначаецца як "сукупнасць канкрэтных патрабаванняў, г.зн. апісанне адпаведных ведаў, уменняў і навыкаў, таго мінімуму, які дазваляе даволі аб'ектыўна сертыфікаваць узровень і якасць падрыхтоўкі студэнтаў па пэўнай дысцыпліне" (Адукацыя і выхаванне. — 1996. — № 6. — С.41). Ёсць і больш агульныя азначэнні. Адукацыйны стандарт разумеецца як "дакумент, што вызначае абавязковыя мінімальна дапушчальныя патрабаванні да арганізацыі, працэсу і вынікаў адукацыйнай дзейнасці, які дазволіць выпускніку вышэйшай навучальнай установы паспяхова выконваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльныя функцыі" (Состояние и перспективы развития высшей школы Республики Беларусь. — Мн., 1997. — С.12).

Галоўнай мэтай стандартызацыі вышэйшай бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі з'яўляецца павышэнне якасці адукацыі выпускнікоў бібліятэчна-інфармацыйных факультэтаў ВНУ, іх канкурэнтаздольнасці на рынку працы. Для дасягнення гэтай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

— вызначыць канчатковыя патрабаванні да выпускнікоў;

— акрэсліць аптымальны пералік дысцыплін і патрабаванняў да іх зместу;

— забяспечыць аб'ектыўную ацэнку якасці навучання, ведаў, навыкаў і ўзроўню развіцця здольнасцей на ўсіх этапах падрыхтоўкі;

— абазначыць аптымальныя патрабаванні да кадравага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння вучэбнага працэсу.

Айчынны і замежны вопыт сведчыць, што распрацоўваць стандарты можна як на базе міжнародных стандартаў, нацыянальных стандартаў замежных краін, так і самастойна з улікам дасягненняў нацыянальнай і замежнай навукі і вытворчасці.

У пачатку 90-х гадоў IFLA зрабіла спробу распрацаваць міжнародны стандарт па бібліятэчнай адукацыі, але пацярпела няўдачу. Немагчымасць распрацоўкі такога стандарта члены рабочай групы звязваюць з наступнымі прычынамі:

— розным узроўнем падрыхтоўкі абітурыентаў у розных краінах (нельга прад'яўляць агульных патрабаванняў да ведаў выпускнікоў школ, на базе якіх будуецца прафесійная адукацыя, у ЗША, Беларусі, Анголе);

— рознымі структурай адукацыі, суадносінамі паміж ступенямі адукацыі (у ЗША бібліятэчную адукацыю можна атрымаць на розных узроўнях, у Польшчы бібліятэкараў рыхтуюць толькі ва універсітэтах, у Германіі ў асноўным —



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у вышэйшых прафесійных школах, а ў Аўстрыі прафесійная бібліятэчная адукацыя наогул адсутнічае);

— розным узроўнем развіцця бібліятэчнай справы, у першую чаргу бібліятэчных тэхналогій.

Такім чынам, мы не можам спасылацца на міжнародны вопыт у гэтым накірунку, бо ў адрозненне ад іншых сфер, у тым ліку бібліятэчнай справы, у адукацыі наогул і ў прыватнасці бібліятэчнай не існуе агульнапрынятага міжнароднага стандарта, які б рэгламентаваў патрабаванні да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. У той жа час IFLA, EUKLID і іншымі міжнароднымі арганізацыямі прыняты шэраг рэкамендацый па арганізацыі бібліятэчнай адукацыі, якія неабходна ўлічваць пры падрыхтоўцы нацыянальнага адукацыйнага стандарта.

У некаторых замежных краінах, у прыватнасці ЗША, Англіі і іншых, распрацаваны нацыянальныя стандарты па падрыхтоўцы спецыялістаў у галінах бібліятэчнай справы і інфарматыкі. Яны, як правіла, распрацаваны бібліятэчнымі асацыяцыямі ці органамі адукацыі і выкарыстоўваюцца пры атэстацыі і акрэдытацыі бібліятэчных школ. Непасрэднае іх прымяненне ў нас немагчымае, таму што яны базіруюцца на нацыянальнай спецыфіцы адукацыі, складзены ў адпаведнасці з заканадаўчымі нормамі сваіх дзяржаў. Але дадзеныя матэрыялы з улікам іх спецыфікі можна выкарыстоўваць як інфармацыйную і метадычную базы пры распрацоўцы нацыянальнага стандарта.

Такім чынам, у нас ёсць адно выйсце — распрацаваць стандарт самастойна, але пры гэтым з максімальнай паўнатой выкарыстаць назапашаны ў гэтым накірунку вопыт замежных калег, а таксама ўлічыць нацыянальныя традыцыі і вопыт прафесійнай адукацыі.

Асноўным патрабаваннем да стандартаў з'яўляецца іх адпаведнасць нарматыўна-прававым актам рэспублікі, а таксама галіне, у якой яны будуць прымяняцца.

У рэспубліцы ўжо праведзена пэўная работа па стварэнні прававой базы для распрацоўкі галіновых

адукацыйных стандартаў. Прыняты Закон аб адукацыі, які стварае заканадаўчую базу развіцця адукацыі ў нашай рэспубліцы. У адпаведнасці з Законам уведзена шматузроўневая сістэма вышэйшай адукацыі, распрацаваны праект Закона аб прафесійнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Пэўныя напрацоўкі ёсць і непасрэдна ў галіне стандартызацыі:

— распрацавана канцэпцыя стандартызацыі сферы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

— вызначана галоўная арганізацыя стандартызацыі і метралагічнага забеспячэння ў сістэме адукацыі, гэта Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі;

— распрацаваны і прыняты стандарт "Сістэма ацэнкі адпаведнасці ў сферы адукацыі";

— распрацаваны праекты стандартаў вышэйшай прафесійнай адукацыі, у тым ліку:

1) СТБ "Вышэйшая адукацыя. Агульныя патрабаванні";

2) СТБ "Патрабаванні да зместу і ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй для гуманітарных накірункаў (спецыяльнасцей)";

3) СТБ "Пералік накірункаў і спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь".

Распрацаваны:

— агульная мадэль адукацыйнага стандарта, прынцыпы і схема пабудовы стандарта па канкрэтнай гуманітарнай дысцыпліне;

— адукацыйныя стандарты па 12-ці гуманітарных дысцыплінах.

У рэспубліцы дзейнічае зацверджаны Міністэрствам адукацыі ў 1998 г. "Пералік спецыяльнасцей, спецыялізацый і кваліфікацый вышэйшых навучальных устаноў". У адпаведнасці з дадзеным дакументам на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльнасці Г.12.01.00 "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" па ўсіх дзесяці зарэгістраваных спецыялізацыях.

Для адкрыцця новай спецыяльнасці ці спецыялізацыі ў адпаведнасці з зацверджаным у 1996 г. Міністэрствам адукацыі палажэннем "Аб адкрыцці новых спецыяльнасцей і спецыялізацый у вышэйшых навучальных установах" неабходныя наступныя ўмовы:

— мець у навучальнай установе не менш двух дактароў або кандыдатаў навук непасрэдна па профілі спецыяльнасці (спецыялізацыі);

— павінна быць патрэбнасць прадпрыемстваў, арганізацый у адзначаных спецыялістах;

— наяўнасць вучэбна-метадычнай і лабараторнай баз па новай спецыяльнасці (спецыялізацыі);

— рэкамендацыі вучэбна-метадычных аб'яднанняў па мэтазгоднасці адкрыцця новай спецыяльнасці (спецыялізацыі) (Палажэнне аб парадку адкрыцця новых спецыяльнасцей і спецыялізацый у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь: Зацверджана загадам міністра адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь ад 2.04.1996 г. № 123. — Мн., 1996. — С.3).

Такім чынам, для пашырэння пераліку нашых спецыяльнасцей і спецыялізацый неабходна:

— павялічыць у рэспубліцы колькасць не толькі кандыдатаў, але і дактароў навук па профілі прапанаваных спецыяльнасцей (што з'яўляецца задачай як факультэта, так і вядучых бібліятэк);

— увесці ў бібліятэках новыя пасады і ўдакладніць функцыянальныя абавязкі супрацоўнікаў бібліятэк;

— узмацніць матэрыяльна-тэхнічную базу універсітэта.

Адна з асноўных задач, якія патрэбна вырашыць у працэсе стандартызацыі, — вызначэнне канчатковых патрабаванняў да выпускнікоў. Хаця на шматлікіх канферэнцыях прымаліся рэкамендацыі аб далучэнні да распрацоўкі кваліфікацыйных характарыстык прадстаўнікоў бібліятэчнай грамадскасці, на жаль, існуючыя

характарыстыкі заўсёды распрацоўваліся, як правіла, толькі супрацоўнікамі факультэта.

У 1998 г. Міністэрствам працы зацверджаны "Тарыфна-функцыянальныя характарыстыкі пасад супрацоўнікаў культурна-асветных устаноў", якія з'яўляюцца пакуль што адзіным нарматыўным дакументам у дадзеным накірунку, і зыходзячы з яго мы павінны фармуляваць патрабаванні да выпускнікоў факультэта.

Наяўнасць асноўных патрабаванняў да спецыяліста дазволіць перайсці да вырашэння другой задачы — вызначэння аптымальнага пераліку вучэбных дысцыплін, якія будуць фарміраваць у студэнтаў адпаведныя патрабаванням веды і навыкі, а таксама вызначыць патрабаванні да зместу гэтых дысцыплін, крытэрыі ацэнкі якасці навучання і ўзроўню развіцця здольнасцей на ўсіх этапах падрыхтоўкі.

Гэта значыць, што ў першую чаргу неабходна вызначыць бюджэт вучэбнага часу, які потым патрэбна размеркаваць паміж дысцыплінамі. Пры распрацоўцы структуры вучэбнага плана спецыяльнасці трэба зыходзіць з нарматываў, закладзеных у метадычных указаннях "Аб парадку распрацоўкі і рэгістрацыі вучэбных планаў для вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь" (зацверджаны 5 красавіка 1994 г.).

Агульны аб'ём вучэбнага часу падрыхтоўкі студэнтаў для атрымання вышэйшай адукацыі размяркоўваецца па чатырох блоках дысцыплін:

— гуманітарныя і сацыяльна-эканамічныя дысцыпліны — 25–35%;

— агульнанавуковыя і агульнапрафесійныя дысцыпліны — 35–45%;

— дысцыпліны спецыяльнага цыкла — 25–30%;

— дысцыпліны спецыялізацый — 10–15%.

Зыходзячы з нарматыву аб тым, што аб'ём аўдыторных заняткаў у тыдзень не павінен перавышаць на 1—3-м курсах 36 гадзін і на 4—5-м курсах — 32 гадзіны, агульны аб'ём аўдыторных заняткаў складзе 4920 гадзін, у тым ліку:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны — 1230–1722 гадз.;

— агульнанавуковыя і агульнапрафесійныя дысцыпліны — 1722–2214 гадз.;

— дысцыпліны спецыяльнага цыкла —1230–1476 гадз.;

— дысцыпліны спецыялізацый — 492–738 гадз.

Дэталёвы разлік колькасці аўдыторных заняткаў неабходны таму, што бюджэт вучэбнага часу — гэта асноўны рэсурс, з якога трэба зыходзіць пры вызначэнні зместу курсаў і іх аб'ёму. Як вядома, жаданні не заўсёды супадаюць з магчымасцямі, выкладчыкам не заўсёды хапае часу на выкладанне дысцыплін. Таму неабходна памятаць аб тым, што калі прапануецца ўвесці новы курс ці павялічыць аб'ём існуючага, то варта шукаць, за кошт скарачэння якой дысцыпліны гэта адбудзецца.

На гэтай падставе факультэт можа ўзяцца за распрацоўку новага вучэбнага плана, праграм курсаў і іншай вучэбна-метадычнай дакументацыі.

**Н.А.Падабедава**, *дацэнт*

## АСПЕКТЫ ВЫКЛАДАННЯ ЗАМЕЖНАЙ МОВЫ Ў ВНУ

Нарматыўныя патрабаванні да ведаў і ўменняў выпускніка вышэйшай навучальнай установы па замежнай мове на сучасным этапе прадугледжваюць:

— валоданне лексічным і граматычным мінімумам, неабходным для навучання вусным і пісьмовым формам зносін;

— уменне весці на замежнай мове гутарку-дыялог агульнага характару, карыстацца правіламі моўнага этыкету, чытаць літаратуру па спецыяльнасці без слоўніка з мэтай пошуку інфармацыі, перакладаць тэксты са слоўнікам, складаць анатацыі, рэфераты, дзелавыя пісьмы на замежнай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ